УДК (070 + 94) (476) “15/16”

# ЖУРНАЛІСЦКАЕ РАССЛЕДАВАННЕ НА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ «СБ. БЕЛАРУСЬ СЁННЯ» (2018–2019 гг.)

***В. Д. Грамовіч*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***В. І. Еўмянькоў***,
канд. філал. навук, дацэнт

У навуцы адсутнічае сістэмнае і адзінае разуменне журналісцкага расследавання (далей – Ж.Р.). На сённяшні дзень існуе тры асноўных падыходы ў вызначэнні паняцця «журналісцкае расследаванне»: умоўна «піцерскі», «маскоўскі» і «заходні». Даследчыкі з Санкт-Пецярбурга лічаць, што Ж.Р. – гэта метад, навукоўцы з Масквы мяркуюць, што – жанр. Заходнія журналісты разглядаюць Ж.Р. як від дзейнасці – працу, заснаваную на пошуках фактаў, якія спрабуюць схаваць ад грамадства.

Даючы вызначэнне журналісцкаму расследаванню, мы можам казаць пра яго як пра своеасаблівы жанр. Журналісцкае расследаванне – аналітычны матэрыял, заснаваны на індывідуальнай рабоце на важную, арыгінальную (не асветленую раней) тэму, якую некаторыя асобы спрабуюць «замяць» або схаваць.

Своеасаблівасць журналісцкага расследавання вызначаецца перш за ўсё яго відамі, наяўнасцю мэты, прадмета, метаду расследавання, спосабу выкладу матэрыялу. Такі набор характарыстык дазваляе казаць пра журналісцкае расследаванне як пра пэўны жанр.

Найбольшае распаўсюджанне ў газеце «СБ. Беларусь Сёння» атрымалі журналісцкія расследаванні на эканамічныя, сацыяльныя і крымінальныя тэмы. Значная частка журналісцкіх расследаванняў закранае праблемы будаўніцтва жылых памяшканняў і незаконнай арэнды; куплі-продажу зямельных участкаў; парушэнняў правоў спажыўцоў. Асноўнымі метадамі збору інфармацыі пры правядзенні журналісцкіх расследаванняў з’яўляюцца інтэрв’ю і назіранне. У сярэднім пры падрыхтоўцы матэрыялу карэспандэнты «СБ. Беларусь Сёння» выкарыстоўваюць 1–2 метады збору інфармацыі.

Журналісцкае расследаванне вылучаецца сярод іншых аналітычных жанраў, але ўсё-такі агульныя рысы прысутнічаюць. Аналітычныя жанры – гэта жанры журналістыкі, якія ўяўляюць сабой маштабнае вывучэнне праблемы. Чытацкая аўдыторыя мае магчымасць у драбнюткіх падрабязнасцях вывучыць інфармацыйныя нагоды, самастойна зрабіць высновы.

**Літаратура**

1. Тертычный, А.А. Расследовательская журналистика: учеб. пособие / А.А. Тертычный. – Москва : Аспект пресс, 2002. – 384 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова